наванні ў адукацыйнай дзейнасці самаадукацыі, самаарганізацыі, самакіравання і заключаецца ў стымулюючым уздзеянні на суб'екта з мэтай яго самараскрыцця і самаўдасканалення ў працэсе супрацоўніцтва з іншымі людзьмі і самім сабой. Сінергетычны падыход грунтуецца на ідэях сістэмнасці, цэласнасці, нелінейнасці, узаемасувязі хаосу і парадку, выпадковасці і неабходнасці, гуманістычных ідэях адаптацыі сістэмы адукацыі да індывідуальных асаблівасцей навучэнцаў і сацыякультурных змен асяроддзя, канцэпцыі самаактуалізацыі, самаразвіцця, самарэалізацыі.

Педагагічная сінергетыка дае магчымасць па-новаму падысці да распрацоўкі праблемы развіцця сістэмы выхавання ў вышэйшай школе, даследуючы яе перш за ўсё з пазіцый адкрытасці, сатворчасці і арыентацыі на самаразвіццё. Мы зрабілі спробу асэнсаваць працэс асобасна-прафесійнага станаўлення студэнта на аснове сінергетычнага падыходу. Гэта дало магчымасць выхаду на новыя сэнсажыццёвыя арыенціры, якія могуць быць сфармуляваны як «асобаснае і прафесійнае станаўленне чалавека ў дынамічным свеце». Так сінергетыка ініцыіруе новыя падыходы да арганізацыі працэсу асобаснага і прафесійнага станаўлення. Цяпер мы ведаем, што гэты працэс уяўляе сабой надзвычай складаную сістэму, здольную спазнаць вялікую колькасць біфуркацый, сістэму, якая валодае вялікай успрымальнасцю ў адносінах да уздзеяння знешняга асяроддзя. Гэта адначасова дае нам надзею і выклікае трывогу: надзею на тое, што нават невялікія педагагічныя ўздзеянні могуць узмацняцца і змяняць траекторыю прафесійнага станаўлення на карысць асобаснага росту (а адсюль вывад, што індывідуальная актыўнасць студэнта ў працэсе асобаснага і прафесійнага станаўлення мае вялікае значэнне), трывогу – таму што наша педагагічная рэчаіснасць, напэўна, назаўсёды згубіла гарантыі стабільных і вечных законаў і прынцыпаў адукацыі.

Антагенез прафесійнага станаўлення – гэта мноства нераўнаважных станаў і працэсаў (пераходаў і крызісаў), у якіх і адбываецца развіццё чалавека як суб'екта будучай прафесійнай дзейнасці. Гэтым тлумачыцца мноства сцэнарыяў індывідуальнага асобаснага і прафесійнага станаўлення, якія не ўкладваюцца ў агульную тэарэтычную канструкцыю. А раўнаважны стан на жыццёвым шляху чалавека – гэта толькі кароткія прыпынкі ў імклівым часе.

*Літаратура*


1. *Абульханова-Славская, К.А.* Стратегия жизни / К.А. Абульханова-Славская. – М.: Мысль, 1991. – 229 с.
2. *Бутрим, Г.А.* Современные приоритеты воспитания студенческой молодежи / Г.А. Бутрим // Вышэйшая школа. – 2001. – № 1. – С. 9–13.
3. Воспитательная работа вуза в системе многоуровневой подготовки специалистов: материалы Респ. науч.-практ. конф. – Минск, 1997. – 168 с.
4. Воспитательные возможности современного вуза: Белорусская Респ. науч.-метод. конф. – Витебск: УО «ВГТУ», 2001 – 246 с.
5. *Гавриловец, К.В.* Воспитание творческой личности учителя в вузе / К.В. Гавриловец // Адукацыя і выхаванне. – 2001. – № 5. – С. 63–67.
6. Гуманистическая парадигма воспитательной работы в вузе: сб. науч. ст. – Минск: ЗАО «Веды», 2003. – 125 с.
7. *Кавалевіч, М.С.* Метадалагічныя асновы сучаснай педагагічнай навукі / М.С. Кавалевіч // Методология, теория и практика естественно-математического образования: сб. материалов Междунар. науч.-практ. конф. / под общ. ред. А.М. Сендер. – Брест: Изд-во БрГУ, 2007. – С. 111–114.
8. *Климов, Е.А.* Психология профессионального самоопределения / Е.А. Климов. – Ростов н/Д.: Феникс, 1996. – 512 с.
9. *Князева, Е.Н.* Основания синергетики. Режимы с обострением, самоорганизация, темпомиры / Е.Н. Князева, С.П. Курдюмов. – СПб.: Алетейя, 2002. – 414 с.
10. *Ковалевич, М.С.* Методологические основания модернизации профессионального образования / М.С. Ковалевич // Известия Международной Академии наук Высшей школы. – 2003.– № 3(25). – 101–106.
11. Педагогическое образование в Республике Беларусь: аналитические материалы: практ. пособие / П.Д. Кухарчик [и др.]; под общ. ред. И.И. Цыркуна. – Минск : БГПУ, 2007. – 235 с.
12. *Пригожин, И.* Порядок из хаоса: новый диалог человека с природой / И. Пригожин, И. Стенгерс; пер. с англ. Ю.А. Данилова. – М.: Прогресс, 1986. – 431 с.
13. *Шумская Л.И.* Методологические подходы к обоснованию воспитательных аспектов процесса социализации студенческой молодежи / Л.И Шумская // Вышэйшая школа. – 1997. – № 5. – С. 23–27.



*Summary*

*The article reflects an attempt to interpret the process of individual and vocational formation of students in the aspect of the theory of self-organization. A synergetic approach is dominating in the research of the essentially uneven educational process. Educational process is explored as an open uneven system in which the casual factor can play a decisive role; the genesis of educational process is ensured by the means of initiating personal tendencies of the development of educational system in higher school.*


*УДК 316.346.32–057.87:37.036*

***Т.С. Гажэўская,***
*аспірант кафедры педагогікі СКД БДУКМ*

# ДУХОЎНАСЦЬ ЯК ФАКТАР ВЫХАВАННЯ ЭСТЭТЫЧНЫХ ГУСТАЎ МОЛАДЗІ: САЦЫЯЛАГІЧНЫ АСПЕКТ

Істотныя грамадска-палітычныя і сацыякультурныя пераўтварэнні, якія адбыліся ў нашай краіне, паказалі, што духоўнасць – гэта сапраўдны прадмет навукі. Асноўныя кры-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зісныя з'явы ў грамадскім развіцці звязаны, у першую чаргу, з праявай бездухоўнасці. Асобае значэнне развіццё духоўнасці набывае для моладзі ва ўмовах, калі ўсё большае распаўсюджанне атрымліваюць выключна матэрыяльныя каштоўнасці: арыентацыя на матэрыяльны дастатак, добрыя магчымасці для адпачынку і забаў, прэстыж, прызнанне і захапленне сяброў, знаёмых і г. д.

Да духоўнага развіцця асобы ўсё больш узрастае інтарэс розных навук: да філасофскіх даследаванняў далучаецца псіхалогія, сацыялогія, педагогіка, культуралогія, якія раскрываюць дадзеную галіну як вышэйшую форму развіцця розуму, культуры асобы і грамадства (І.А. Гундараў, А.С. Яршоў, М.В. Зінчанка, І.М. Ільічова, В.П. Казначэеў, С.Б. Крымскі, П.В. Сіманаў і інш.).

У псіхалагічнай і педагагічнай літаратуры праблема, звязаная з развіццём духоўнасці асобы ў кантэксце культуры, праз прызму каштоўнаснага падыходу разглядаецца ў працах Е.В. Бандарэўскай, Е.П. Белазерцавай, Т.І. Уласавай, І.А. Калеснікавай, Л.П. Разбягаевай, Н.Е. Шчурковай і інш. Разглядаемыя асобасна арыентаваныя культуралагічныя канцэпцыі заснаваны на чалавекацэнтрыраванай пазіцыі, асобасным і культуралагічным падыходах, ідэях развіцця выхавання ў кантэксце культуры, нацыянальна-культурнай ідэнтыфікацыі, гуманізацыі выхавання.

Праблема духоўнасці як сацыякультурнай з'явы раскрываецца ў працах І.А. Салаўцовай, Н.М. Барытко, Б.С. Братуся і інш. У іх адзначаюцца адрозненні псіхалагічных падстаў развіцця духоўнасці ў праваслаўнай і свецкай педагогіцы, разглядаецца тэндэнцыя пошуку «кропак судакранання» паміж рознымі педагагічнымі парадыгмамі.

Да праблем удасканалення тэорыі, методыкі і арганізацыі сацыякультурнай дзейнасці (СКД) у галіне даследавання духоўнасці як феномена культуры звяртаюцца ў сваіх працах М.А. Арыярскі, С.Б. Брыжатава, А.Д. Жаркоў, Т.Г. Кісялёва, Е.Н. Карчагін, Ю.Д. Красільнікаў, А.В. Несцярэнка, О.В. Пярвушына, А.Д. Плюснін, А.В. Сакалоў, В.С. Магун, В.Н. Трыёдзін, В.В. Туеў, Н.Н. Ярашэнка і інш.

Працэс развіцця духоўнасці з пункту гледжання анталагічнага падыходу да асобы, яе сутнасці як цэласнасці разглядаецца ў працах Л.М. Лузінай, Н.Н. Нікіцінай.

У наш час у Беларусі складваюцца спрыяльныя ўмовы для духоўнага росту моладзі: будуюцца храмы, адкрываюцца нядзельныя школы, з'яўляецца шматлікая духоўная літаратура, ствараюцца харавыя калектывы на базе рэлігійных устаноў, якія маюць духоўны напрамак сваёй творчай дзейнасці. Сацыякультурная дзейнасць гэтых калектываў аналагічная асноўным функцыям самадзейнай мастацкай творчасці, бо яна носіць грамадскі характар і звязана з выхаваннем творчай і грамадска актыўнай асобы. Такія хары не толькі прымаюць удзел у царкоўных абрадах, але і актыўна вядуць канцэртную і дабрачынную дзейнасць. Іх яшчэ можна назваць літургічнымі харавымі калектывамі, бо асноўнай дзейнасцю гэтых аб'яднанняў з'яўляецца ўдзел у св. Літургіі.

Значная частка моладзі далучаецца да гэтай сферы сацыякультурнай дзейнасці, асноўнымі формамі якой з'яўляюцца:

- традыцыйнае правядзенне храмавых свят;
- духоўныя канцэрты;
- актыўны ўдзел хароў у царкоўных богаслужэннях;
- разнастайная дабрачынная дзейнасць (дабрачынныя канцэрты ў сіроцкіх дамах, удзел у выстаўках мастацкай творчасці, прэзентацыях духоўных кніг, фонавыя запісы да кінафільмаў, дабрачынныя канцэрты ў музеях);
- паломніцтва да святых месц.

Характэрнай асаблівасцю царкоўна-пеўчых традыцый з'яўляецца разнастайнасць рэпертуару, які ўключае ў сябе духоўныя харавыя творы розных стыляў, эпох, напрамкаў; значная колькасць традыцыйных кананічных песнапенняў, якія адносяцца да розных перыядаў літургічнага года; харавыя творы свецкіх кампазітараў, напоўненыя асобым сэнсам – духоўнасцю. Дзякуючы такім формам сацыякультурнай дзейнасці і асаблівасцям царкоўна-пеўчых традыцый нам уяўляецца магчымым выхаванне эстэтычных густаў моладзі.

Даследчыкі адзначаюць, што густ можа фарміравацца як стыхійна, так і мэтанакіравана [2; 5; 8]. Наша даследаванне засноўваецца на ідэі выхавання эстэтычнага густу ўдзельнікаў літургічнага харавога калектыву ва ўмовах *мэтанакіраванай* духоўнай творчай дзейнасці. Гэта праблема становіцца ў рад актуальных задач педагогікі СКД, бо ў наш час назіраецца падзенне ўзроўню выканальніцкага майстэрства, выбар музычных твораў рознай мастацкай вартасці, нярэдка са з'яўленнем нізкапробных у мастацкіх адносінах твораў, слабая рэалізацыя выхаваўчага патэнцыялу «высокага» духоўнага музычнага мастацтва. Акрамя таго, педагагічная тэорыя не дае вычарпальнага адказу на пытанне аб шляхах вырашэння супярэчнасцей паміж:

- наяўнасцю шырокай базы даследаванняў філасофскага і педагагічнага аспектаў праблемы фарміравання эстэтычнага густу і недастатковай тэарэтычнай і практычнай распрацаванасцю пытання ў адносінах да сферы духоўнага харавога мастацтва;
- патрэбай сучаснага грамадства ў педагогах з развітым эстэтычным густам і рэальным узроўнем сфарміраванасці дадзенай якасці ў іх,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якi характарызуецца наяўнасцю сур'ёзных цяжкасцей у ацэначных дзеяннях і эстэтычных меркаваннях.

У галіне духоўнай харавой музыкі назапашана вялікая колькасць твораў, якія маюць высокую эстэтычную і маральную каштоўнасць. Рэлігійная (хрысціянская) музыка, як адзначаюць даследчыкі (І.І. Карпушын, І.В. Кошміна, Л.І. Раманаў, Е.Г. Якаўлеў і інш.) [1; 4; 6–7], дваістая па сваім змесце, двухадзіная і «объективно несет в своих образах как общечеловеческое, прежде всего специфически художественное, так одновременно и религиозное идейное содержание», – адзначаў яшчэ ў канцы мінулага стагоддзя А.Н. Карасёў [3, с. 95]. Таму адны і тыя ж творы хрысціянскага музычнага харавога мастацтва веруючымі могуць успрымацца рэлігійна-эстэтычна, а свецкі характар успрымання, нягледзячы на наяўнасць у іх змесце рэлігійнага зместу і ідэйнасці, будзе маральна-эстэтычным і мастацкім.

Е.Г. Якаўлеў двухадзінства вобразаў рэлігійнага мастацтва вызначае як «мастацка-рэлігійную цэласнасць». Ён піша аб тым, што культавая архітэктура, іконы, музыка з'яўляюцца канкрэтнымі носьбітамі мастацка-рэлігійнай культуры, якія ўключаюць у сябе «и религиозное, и художественное в едином целом, и здесь невозможно отдать предпочтение тому или другому, так как это – целостность, хотя и противоречивая» [7, с. 55–56].

Сапраўднае мастацтва нават у сістэме рэлігійнага культу застаецца самім сабой – мастацтвам, якое нясе мастацка-эстэтычную каштоўнасць. Таму людзі з развітым эстэтычным густам любуюцца архітэктурай сабораў, іх фрэскамі, атрымліваюць асалоду ад гучання старадаўніх песнапенняў; прыцягвае ў іх высокая сапраўдная прыгажосць, мастацкая дасканаласць, асобая эмацыянальная сфера і вобразы.

Асноўным стрыжнем духоўнага музычнага мастацтва заўсёды служыла «Слова» – носьбіт духоўна-маральнага і рэлігійнага зместу. Музычны тэкст больш рэльефна адцяняе агульны сэнс слоў і асноўны характар духоўнага твора, дзякуючы сваёй параўнальнай працягласці, дае магчымасць глыбокага пранікнення розумаў у сэнс выконваемага, узмацняючы маральна-эстэтычны эфект на слухача.

Глыбінны сэнс духоўнай харавой музыкі можна спасцігнуць, ведаючы спецыфіку кананічнага царкоўнага тэксту. Змест і вобразы гэтай музыкі вынікаюць з цэласнасці хрысціянскага светапогляду: у ёй няма канфлікту, барацьбы супрацьлеглых сіл і чалавек з'яўляецца часткай сусвету, часткай вялікай гармоніі свету. Адсюль той спакой, які яна вылучае, дабратворна ўздзейнічае на маральна-духоўную сферу чалавека.

Велічная прастата, пакорліва-ўзвышаны спакой, мудрая бясстраснасць – галоўныя якасці духоўнай музыкі. У ёй выражаны глыбокія філасофскія думкі аб чалавечым жыцці і смерці, аб жыцці зямным і вечным, яна нясе высокую маральнасць, любоў да навакольнага свету, любоў і спачуванне ў адносінах да чалавека, вучэнне пра дабро, пачуццё прыгажосці і гармоніі, унутранага спакою і сканцэнтраванасці, дысцыпліны думак і пачуццяў.

Знаёмячы моладзь з духоўнай харавой музыкай і іншымі творамі мастацтва на рэлігійную тэматыку, педагог тым самым далучае яе да вялізнага чалавечага вопыту, сканцэнтраванага ў музычным мастацтве. У духоўнай музыцы, якая валодае асобым энергетычным зарадам і вялікай сілай эмацыянальнага ўздзеяння, адлюстроўвае маральна-эстэтычныя і этычныя ідэалы чалавецтва, найбольш поўна і ярка прадстаўлены ўзоры высокага мастацтва. Харавая дзейнасць дае ўдзельнікам магчымасць быць не толькі ўладальнікамі мастацкіх каштоўнасцей, але і іх стваральнікамі. Дзякуючы калектыўнай харавой творчасці праяўляюцца і развіваюцца музычныя здольнасці моладзі, фарміруецца эстэтычнае ўспрыманне духоўнага музычнага мастацтва і развіваецца эстэтычны густ.

Літаратура

1. Искусство в мире духовной культуры. – Киев: Наукова думка, 1985. – 239 с.
2. *Калашник, Н.Г.* Прикладная густосология / Н.Г. Калашник, Н.А. Зацепина. – Запорожье: Полиграф, 2004. – 255 с.
3. *Карасев, А.Н.* Беседы о церковном пении и его исполнении. Извлечение из «Методики пения» / А.Н. Карасев. – Пенза, 1898. – Ч. 2. – С. 137–249.
4. *Карпушин, И.И.* Искусство и религия / И.И. Карпушин. – М.: Педагогика, 1991. – 159 с.
5. *Коган, Л.Н.* Художественный вкус / Л.Н. Коган. – М.: Мысль, 1966. – 213 с.
6. *Кошмина, И.В.* Наследие духовной культуры: Музыка и изобразительное искусство: Пособие / И.В. Кошмина, С.В. Трофимова. – М., 1998. – 103 с.
7. *Яковлев, Е.Г.* Искусство и мировые религии / Е.Г. Яковлев. – М.: Знание, 1959. – 400 с.
8. *Яковлев, Е.Г.* Эстетический вкус как категория эстетики / Е.Г. Яковлев. – М.: Знание, 1986. – 62 с.

Summary

*In the article the problem of religiosity, which is one of factors of young generation education is analysed. All this is connected with creative, public and active personality education.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ